36. Общий план высшего образования Вьетнама на 2021-2030 годы [Электронный ресурс] // Министерство образования Народной Республики Китай. – Режим доступа: https://moet.gov.vn/giaoducquocdan/giao-duc-dai-hoc/Pages/default.aspx?ltemID=7083. – Дата доступа: 26.02.2024. (на кит. яз.).

37. Перспективы интернационализации высшего образования: мотивы и реальность / Ф. Г. Альтбах [и др.] // Исследования высшего образования. – 2006. – № 1. – С. 12–21. (на кит. яз.).

**(Дата подачи: 28.02.2024 г.)**

*А. К. Шымак*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск

*A. Shymak*
Belarusian State University, Minsk

**УДК327(470+571)**

# МАСКОЎСКАЕ ПАСОЛЬСТВА АНТОНІЯ БАНУМБРЭ (1472–1473 ГГ.)

# MOSCOW EMBASSY OF ANTHONY BANUMBRE (1472–1473)

*У артыкуле разглядаюцца асноўныя абставіны, якія прывялі да арганізацыі пасольства папскага легата ў Маскву. Звяртаецца ўвага на асаблівасці пантыфікатаў 1458–1484 гг., на фоне якіх разгортваліся асноўныя падзеі, звязаныя з заключэннем шлюбу маскоўскага вялікага князя і візантыйскай прынцэсы.*

*Ключавыя словы: Апостальская сталіца; Рымская курыя; Маскоўскае княства; пасольства; легат.*

*The article examines the main circumstances that led to the organization of the papal legate's embassy in Moscow. Attention is drawn to the peculiarities of the pontificates of 1458–1484, against the background of which the main events related to the marriage of the Grand Duke of Moscow and the Byzantine princess.*

*Keywords: Apostolic Capital; Roman Curia; Moscow Principality; embassy; legate.*

Гісторыя заключэння шлюбу Івана ІІІ і Зоі (Соф'і) Палеолаг пачынаецца, згодна з вялікакняскім летапісным зборам, 11 лютага 1469 г., калі ў Маскву прыбыў пасол кардынала Вісарыёна Юрый Грэк, які і прывёз звесткі, што ў Рыме знаходзіцца «православная христьянка», «дщерь Яморейского деспота Фомы Ветхословца» Сафія. Абмеркаваўшы прапанову кардынала Вісарыёна з мітрапалітам Філіпам, маці і баярамі, Іван ІІІ адправіў у сакавіку 1469 г. у Рым пасольства на чале з Джан Батыста дэла Вольпе, вядомым у Маскве пад імем Івана Фразіна [1, с. 225]. Згаданая гісторыя ўжо неаднаразова станавілася аб'ектам вывучэння гісторыкаў. Па-першае, уздымаліся пытанні кшталту, хто быў ініцыятарм гэтага саюзу, якая доля прыватнай ініцыятывы ў гэтых перамовах, хто атрымаў большыя прыбыткі ад гэтых падзей.

У межах дадзенага артыкула пастараемся паглядзець на палітычныя рэаліі, якія выклікалі пасольства папскага легата Антонія Банумбрэ ў Маскву, а таксама на галоўных дзеючых асоб гэтага «шлюбнага карнавалу».

Іван III узышоў на маскоўскі прастол у 1462 г., атрымаўшы ад свайго бацькі Васіля II вялікую тэрыторыю з гарадамі Масква, Уладзімір, Ніжні Ноўгарад, Суздаль. Астатняя спадчына была ў руках яго братоў. Такім чынам, Івану III, па-першае, неабхода было пазбавіцца перажыткаў удзельнай сістэмы. У 1467 г. памерла Марыя Цвярская, шлюб з якой працягваўся з 1452 па 1467 г. У пошуках новага саюзу позірк скіраваўся на прынцэсу з дому візантыйскіх імператараў. У часы кіравання Івана III маскоўская дзяржава будавалася як вялікая асабістая вотчына князя, а таксама як прынцыпова новае ўтварэнне – «государство всея Руси».

Зоя Палеалог, якая ў рускіх летапісах называецца Соф'яй, нарадзілася каля 1455 г., была дачкой Фамы Палеалога, дэспата Марэі, а таксама прыходзілася пляменніцай візантыйскага імператара Канстанціна Палеалога. Пасля падзення Канстанцінопаля Фама Палеалог перавёз сям'ю на востраў Корфу, а пазней Зоя разам з братамі Андрэем і Мануілам апынуліся ў Рыме. Пасля смерці Фамы Палеалога яго дзецьмі стаў апекавацца пры двары папы Паўла II кардынал Вісарыён.

Кардынал Вісарыён атрымаў выдатную адукацыю ў Канстанцінопалі, у 1423 г. стаў манахам, а пазней – святаром. Вывучаў філасофію, быў ігуменам манастыра Святога Васіля ў Канстанцінопалі, з 1437 г. – мітрапаліт Нікейскі. У 1438–1439 гг. Вісарыён прымаў удзел у Феррара-Фларэнційскім саборы і выступаў за унію заходняга і ўсходняга хрысціянства. У 1439 г. стаў кардыналам. З-за сваіх поглядаў быў вымушаны пакінуць Канстанцінопаль. Пасля 1453 г. шмат намаганняў прыкладваў, каб арганізаваць саюз супраць туркаў.

Пераломным момантам у гісторыі Еўропы стаў захоп Канстанцінопаля Асманскай імперыяй. Зразумела, што і для Апостальскай сталіцы гэта падзея стала ўзрушальнай. Паспяховая асада Белграда ў 1456 г., захоп амаль усіх сербскіх тэрыторый, падзенне баснійскага замка Яйцэ – на такім фоне распачаўся пантыфікат П'етра Барба – папы Паўла II (1464–1471 гг.). Рым стаў шукаць шляхі для арганізацыі антыасманскай кааліцыі. З такой прапановай у 1464–1471 гг. папа звяртаўся да шэрагу еўрапейскіх двароў [2, s. 49].

Арганізацыя маскоўскага пасольства 1472–1473 гг. не была вынікам толькі імгненнага рашэння папы Сікста IV. На яго выбар уплывалі абставіны папярэдніх пантыфікатаў – Пія II і Паўла II. Падчас усіх трох канклаваў (1458, 1464 і 1471 гг.) гучалі абяцанні кожнага з рымскіх папаў арганізаваць сумесны крыжовы паход супраць Асманскай імперыі.

У жніўні 1458 г. на саборы ў Мантуі галоўным пытаннем было абмеркаванне наступу туркаў, а галоўнымі аратарамі – Пій II і кардынал Вісарыён. Словы, якія прагучалі на саборы, добра ілюструюць той настрой, які панаваў у Рыме: «Увы вам, вожди и короли христианские! увы вам, возрожденные

к жизни от источника Святого крещения и именем Христа Спасителя осеняемые, Чьим именем вы, цари, правите, Чьей властью властвуете, Кем все спасены народы. К вам, к вам, говорю, взываю я, ради кого Господь наш излил драгоценную свою кровь. Встанем же против врагов Его, против врагов веры, не усумнимся и самое жизнь нашу принесть в жертву; предварим честную смерть, покуда можно, и да не выйдет, как сказал славный философ, что смерть придет-таки в скорости, но уж не с тою честию. Пусть многотрудным и опасным мнится это дело, но стоит только возжелать, и будет нетрудно, напав на них, снискать победу. Ибо не тщанием и не доблестью, а нашею вялостию, да леностию, да небрежением и несогласием те сильны; одолевая одного соседа за другим поочередно и пользуясь терпимостью тех, кто из-за усобицы позволяет гибнуть другому, распространилась эта чума и, подчиняя себе всякого, кто лишен споборников, дошла даже до пределов Паннонии, а ныне угрожает уже и западным. Ополчимся же напротиву, оборвем бешеный их порыв и то, что отнято у греков, воскресим воинским умением и доблестью ради латинского имени и славы!» [3, с. 16–17].

Верагодным удзельнікам хрысціянскага антыасманскага саюзу мог стаць і маскоўскі князь. Палітычныя рэаліі гэтага рэгіёна былі добра вядомымі на Апенінскім паўвостраве. Паводле загада міланскага герцага Франчэска Сфорца прыблізна ў 1450 г. быў падрыхтаваны дакумент, у якім давалася геаграфічнае апісанне межаў дзяржавы *La Rusia* [4, с. 457]. У 1458 г. Эней Сільвія Піккаламіні, будучы папа Пій ІІ, да Еўропы ўжо адносіў не толькі Вялікае Княства Літоўскае, але і рускія землі [5].

Зацікаўленасць праяўлялася і з маскоўскага боку. Падчас кіравання Васіля ІІ у 1461 г. у Мілан быў накіраваны ў якасці пасла грэк Мікалай Раллі. Міланскі герцаг гэта пасольства разглядаў з пункту гледжання магчымых сумесных мерапрыемстваў супраць туркаў. Такім чынам, да моманту першай спробы заключэння шлюбу паміж Іванам ІІІ і Соф'яй Палеолаг у 1469 г. ужо існавала пэўная традыцыя італа-рускіх культурных і палітычных кантактаў, у выніку якіх паступлова складаліся ўяўленні аб Італіі. З канца 1430-х гг. яны сталі фарміравацца на аснове непасрэдных уражанняў рускіх людзей. Менавіта гэта зрабіла магчымым адыход ад пераважна негатыўнага яе ўспрымання. У 1440–1460-я гг. фарміруецца вобраз Італіі, які дапускае патэнцыяльную магчымасць супрацоўніцтва праваслаўнай Русі з гэтай каталіцкай зямлёй. У эпоху Васіля ІІ маскоўская шляхта была досыць добра дасведчаная аб узроўні тэхнічных дасягненняў у Італіі. Да 1460-х гг. меўся станоўчы досвед працы «фрагаў» у Маскве, умела выкарыстаны вялікім князем для рашэння задач дзяржаўнай важнасці [6, с. 33].

У Рыме немалыя спадзяванні ўскладаліся на дынастычны шлюб Івана ІІІ з Соф'яй Палеалог. Меркавалася, што Іван ІІІ з-за свайго шлюбу з Соф'яй будзе змагацца за свае правы на «ўсходнюю імперыю». Выдаткі на падарожжа «каралеве рускай Зоі» аплачваліся са спецыяльнай касы, прызначанай выключна на патрэбы вайны з туркамі, што таксама сведчыць аб планах Апостальскай сталіцы [7, с. 162–170]. Роспісы ў шпіталі Святога Духа

ў Рыме невядомага аўтара паказваюць, як папа Сікст IV перадае грошы Соф'і Палеалог (малюнак).



**«Andream Palaeologum Poloponusi et Leonardum Toccum Epiri Dijnastia a Turcam türanno exutos regio sumptu aluit. Siphiam Thomae Palaeologi filiam Ruthenorum ducci nuptamCum alijs muneribus tum sex mille aureorum dote auxit»**
**«Андрея Палеолога, Владетеля Пелопонеза и Леонардо Токко, Владетеля Эпира, изгнанных тираном Турок, он (Сикст IV) одарил царским содержанием; Софии, дочери Фомы Палеолога, обрученной с князем Русских, сверх иных даров, помог шестью тысячами золотых»**
*Хрептович-Бутенев, К. А.* Флоренция и Рим в связи с двумя событиями из Русской Истории XV века. Краткий иллюстрированный очерк / К. А. Хрептович-Бутенев. – М.: Печатня А. Снегиревой, 1909. – С. 48–51.

Акрамя таго, гэтым шлюбам займаўся кардынал Вісарыён. Франчэска дэла Равэрэ падчас канклава ў жніўні 1471 г. ужо як папа Сікст IV даў пэўныя палітычныя абяцанні: рэфармаваць Рымскую курыю, склікаць Сусветны сабор, а таксама арганізаваць экспедыцыю супраць туркаў. Да новага пантыфіка вельмі прыязна ставіўся кардынал Вісарыён [8, с. 6]

Верагодна, спадзеючыся на магчымасць такога саюзу, папа Сікст IV накіраваў у Маскву ў суправаджэнні Соф'і Палеалог легата a latere Антонія Банумбрэ. У папскім наказе пасланцу гаварылася: «[…] Мы ничего не желаем горячее, как видеть вселенскую церковь объединенной на всем ея протяжении и все народы идущие по пути к блаженству. Вот почему мы охотно изыскиваем средства, при помощи которых наши желания могут быть осуществимы» [7, с. 194–195].

Так склалася, што ў асабліва важных выпадках папа накіроўваў з прадстаўнічымі функцыямі легата a latere – кардынала Рымскай курыі. Яго поўная назва – a latere Pontificis – гэта значыць асоба, блізкая да папы. Такі легат уваходзіў у найбліжэйшае акружэнне пантыфіка. Звяртае на сябе ўвагу асоба папскага пасланніка. Антоній Банумбрэ нарадзіўся дзесьці

ў першай палове XV ст. У маладым узросце стаў манахам-аўгусцінцам. Дакладна вядома, што з 1467 г. быў біскупам Акчыі на Корсіцы. Карыстаўся даверам і павагай з боку і папы Паўла II, і Сікста IV [9, с. 170]. Таму выглядае невыпадковым, што быў прызначаны ў чэрвені 1472 г. суправаджаць Соф'ю Палеалог у Маскву.

Падарожжа Зоі (Соф'і) праходзіла праз Вітэрба, Сіену, Фларэнцыю, Балонью, Вічэнцу, Нюрнберг, Любэк, Рэвель, Дэрпт, Пскоў, Ноўгарад і далей да Масквы. Даследчык П. Пірлінг адзначаў, што летапісы Нюрнберга апавядалі пра папскага легата, які накіраваўся ў далёкія краіны, каб ускласці на Івана III каралеўскую карону, а таксама каб прапаведаваць хрысціянскую веру [10, с. 83]. Гэты шлях стаў выкарыстоўвацца пасля далучэння Ноўгарада да Маскоўскай дзяржавы. У XIII–XIV стст. італьянскія гандляры ехалі праз Крым і Чорнае мора. Аднак у пачатку 1470-х гг. паўднёвая дарога стала небяспечнай. Відаць, праезд праз землі Вялікага Княства Літоўскага таксама выклікаў пытанні, нягледзячы на тое, што ў 1470 г. папа Павел II скіраваў сваё брэвэ да Казіміра IV і прасіў бяспечнага праезду для маскоўскіх паслоў.

Выдатны знаўца гэтых падзей, гісторык XIX ст. П. Пірлінг так апісваў момант уезду Соф'і ў Маскву: «12 ноября по дороге, покрытой снегом, София прибыла в Москву. Эта столица, столь же обширная, сколь мало изящная, покрытая своим зимним саваном, с жалкими деревянными домами, с однообразными рядами лавок, с городскими полуразрушенными стенами, с скромным Кремлем, должна показаться скучной и печальной принцессе, привыкшей к блеску Рима и Византии» [10, с. 88–89]. Цікава, што сучасным расійскім гісторыкам гэтыя падзеі падаюцца з іншым адценнем: «Хочется верить, впрочем, что Софья находила, чем любоваться в дороге. Прозрачные озера, янтарные закаты и сонные туманы над водной гладью – всё это пленяет сердце не меньше, чем томная и страстная природа навсегда покинутого Софьей юга» [11, с. 152].

Місія А. Банумбрэ была вельмі няпростай, і гэта стала бачным адразу, калі падарожнікі наблізіліся да Масквы. Наперадзе пасольства неслі крыж, зразумела, каталіцкі. Мітрапаліт Філіп паставіў умову, што калі папскі легат з лацінскім крыжам увойдзе ў адны дзверы, то ён выйдзе праз іншыя. «…уже близ Москвы бывшим им, сказаша князю великому, что тот посол Антоний легатос идет с царевною, а перед ними крыж несут, поняже бо папа то почесть великую дал послу своему идти так ему по всем землям им до Москвы» [12, с. 150–151]. Да пасольства былі накіраваныя ганцы з просьбай прыбраць крыж. Антоній Банумбрэ праявіў дыпламатычную гнуткасць і пагадзіўся. Перад папскім легатам паўстала рэальная карціна спраў у Маскоўскай дзяржаве і тое, як на самай справе тут адносіліся да каталіцтва. Між іншым яшчэ ў 1461–1462 гг. антылацінскія настроі маскоўскага духавенства ўвасобіліся ў «Слове на латыню» [13, с. 66].

А. Банумбрэ правёў у Маскве больш за два месяцы. У гэты час адбыўся так званы рэлігійны дыспут. Звесткі пра яго мы маем толькі з рускіх

летапісаў, і яны не знаходзяць пацвярджэння ў іншых крыніцах. Аўтары рускіх летапісаў паведамляюць, што мітрапаліт Філіп з дапамогай кніжніка Мікіты Паповіча прымусіў папскага легата апраўдвацца за няздольнасць прывесці хоць якія свае аргументы [14, с. 197]. Падобную карціну летапісы намалявалі і пра падзеі 1582 г., калі ўжо Іван IV вёў перамовы з іншым папскім пасланнікам – з Антоніа Пассевіна. Ад'езд Банумбрэ з Масквы супаў па часе са смерцю галоўнага ініцыятара ўсходняй палітыкі Рымскай курыі кардынала Вісарыёна. У сувязі з гэтым скончыўся і пэўны этап у гісторыі адносін Масквы і Рыма [15, s. 159].

Падрыхтоўка і сам ход пасольства Антонія Банумбрэ ў Маскву сведчылі пра тое, што гэты рэгіён з'яўляўся прадметам увагі з боку Апостальскай сталіцы. Можна адзначыць, што тут рымскіх пантыфікаў больш цікавілі верагодныя саюзнікі ў барацьбе з Асманскай імперыяй, чым пытанні канфесійнага характару. Дыпламатычная місія 1472–1473 гг. рыхтавалася старанна і ўважліва, былі задзейнічаны нешараговыя асобы Рымскай курыі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Вологодско-Пермская летопись // Полное собрание русских летописей / отв. ред. М. Н. Тихомиров. – М.-Л.: Изд. Акад. наук СССР, 1959. – Т. 26. – 412 с.

2. *Seppelt, F. X.* Papstgeschichte von den Anfängen bis zur Gegenwart / F. X. Seppelt. – München: Josef Kösel & Friedrich Pustet, 1933. – 551 s.

3. *Медведев, И. П.* Речь Виссариона Никейского на Мантуанском соборе о падении Константинополя [Электронный ресурс] / И. П. Медведев, А. К. Гаврилов // Византийский Временник. – 2004. – Т. 63 (88). – Режим доступа: http://vremennik.biz/opus/BB/63/53292. – Дата доступа: 25.02.2024.

4. *Рутенбург, В.И.* Итальянские источники о связях России и Италии в XV в. / В. И. Рутенбург // Институт истории. Ленинградское отделение. Труды. – 1964. – Вып. 7: Исследования по отечественному источниковедению. Сборник статей, посвященных 75-летию профессора С. Н. Валка. – С. 455–462.

5. *Мартынюк, А. В.* Литва и Русь в сочинениях Энея Сильвия Пикколомини / А. В. Мартынюк // Шосты Міжнародны Кангрэс даследчыкаў Беларусі: працоўныя матэрыялы, Каўнас, 7–9 кастр. 2016 г. – Kaunas: Vytautas Magnus University Press, 2017. – Т. 6. – С. 60–64.

6. *Матасова, Т. А.* Складывание итальянского направления политики московских князей в XV в. / Т. А. Матасова // Вестник Московского университета. Сер. 8. История. – 2010. – № 1. – С. 26–34.

7. *Пирлинг, П.* Россия и папский престол / П. Пирлинг. – М.: Современные проблемы, 1912. – 452 с.

8. *Доброва, У. П.* Сикст IV – покровитель искусств и ученый богослов [Электронный ресурс] / У. П. Доброва // Вестник Московского университета. Сер. 8. История. – 2017. – № 2. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/sikst-iv-pokrovitel-iskusstv-i-uchenyy-bogoslov/viewer. – Дата доступа: 25.02.2024.

9. *Ferretto, A.* Per Antonio Bonombra vescovo di Accia (1467–1480) / A. Ferretto // Giornale ligustico di Archeologia, Storia e Letteratura. – 1897. – XXII. – P. 168–171.

10. *Пирлинг, П.* Россия и Восток. Царское бракосочетание в Ватикане, Иван III и София Палеолог / П. Пирлинг. – СПб.: Изд. А. С. Суворина, 1892. – 235 с.

11. *Матасова, Т. А.* Софья Палеолог / Т. А. Матасова. – М.: Молодая гвардия, 2017. – 299 с.

12. Патриаршая или Никоновская летопись // Полное собрание русских летописей; отв. ред. М. Н. Тихомиров. – М.: Наука, 1965. – Т. 12. – 266 с.

13. *Казакова, Н. А.* Западная Европа в русской письменности XV–XVI веков. Из истории международных культурных связей России / Н. А. Казавкова. – Л.: Наука, 1980. – 278 с.

14. Софийские летописи // Полное собрание русских летописей. – СПб.: Тип. Э. Праца, 1853. – Т. VI. – 358 с.

15. *Bojko, K.* Próby wciągnęcia Księstwa Moskiewskiego do koalicji antytureckiej w latach 1437–1472 / K. Bojko // Swiat chrześćijański i Turcy Osmańscy w dobie bitwy pod Warna / pod. red. D. Quirini-Popławskiej. – Kraków: Nakł. Uniwer. Jagiellońskiego, 1995. – S. 149–160.

**(Дата падачы: 27.02.2024 г.)**